BLR




# СКАРБЫ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ







Латвія I Літва I Беларусь

Гэтая праграма фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

ЛАТВІЯ
ЛІТВА
БЕЛАРУСЬ
2014-2020
















**Адкрый для сябе, даследуй і знаёмся са скарбамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Латвіі, Літвы і Беларусі!**

Маршрут дае падарожнікам магчымасць наведаць турыстычныя аб’екты нематэрыяльнай культурнай спадчыны Зэмгальскага рэгіёна, Нэрэцкага краю, горада Екабпілса (LV), Вільнюскага і Рокішкіскага раёнаў (LT), а таксама Полацка і яго ваколіц (BLR).

Нематэрыяльная культурная спадчына Латвіі, Літвы і Беларусі і звязаныя з яе спасціжэннем турыстычныя паслугі адрозніваюцца ў кожнай краіне. Напрыклад, у Латвіі можна ўбачыць і ацаніць народныя строі розных этнаграфічных рэгіёнаў, шматлікія сямейныя святочныя традыцыі і гадавыя святы, гульні, песні, танцы, лазневыя рытуалы, музычныя інструменты, упрыгажэнні, рэцэпты і навыкі прыгатавання традыцыйных страў, латышскі жыццёвы ўклад і іншыя каштоўнасці, якія атрымалі адзнакі «Латышская спадчына» і «Латышская кухня», што спрыяла іх папулярызацыі ў краіне. У Літве ж гурманы могуць пакаштаваць традыцыйныя шэдэўры, папулярныя ў турыстаў – «грыбочкі» і шакоціс, якія ўнесены ў спіс нацыянальнай кулінарнай спадчыны краіны. Акрамя таго, у суседзяў можна пакаштаваць стравы татарскай кухні, даведацца пра этнаграфічныя асаблівасці і старажытныя тэхналогіі, а ў Беларусі – пазнаёміцца з народнымі танцамі, звычаямі і песнямі, асаблівымі антыфоннымі спевамі, якія характэрны толькі для Полаччыны.

Прапанаваны маршрут дае падарожнікам магчымасць убачыць і пазнаёміцца з унікальнымі турыстычнымі аб’ектамі і іх гаспадарамі, якія захоўваюць, зберагаюць і перадаюць наступным пакаленням самабытныя каштоўнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны Латвіі, Літвы і Беларусі, дапамагаючы сучаснікам як павялічыць веды, так і глыбей зразумець свае карані.

**Даследуй каштоўнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія павінны перадавацца наступным пакаленням як невычэрпная крыніца этнічнай ідэнтычнасці!**

## Змест

Уводзіны ........ 3

Вільнюскі раён, Літва ........ 4
Рокішкіскі раён, Літва ........ 7

Нэрэцкі край, Латвія ........ 10
Зэмгальскі рэгіён, Латвія ........ 11
Карта аб’ектаў агляду ........ 14
Горад Екабпілс, Латвія ........ 21

Горад Полацк і Полацкі раён, Беларусь ........ 25




## Абазначэнні

Для наведвання патрабуецца папярэдняя заяўка!

Для наведвання групай патрабуецца папярэдняя заяўка!

Для ўдзелу ў праграмах, майстар-класах патрабуецца папярэдняя заяўка!

Бліжэйшы да аб’ектаў турыстычны інфармацыйны цэнтр / пункт / пастаўшчык інфармацыі.



ЛІТВА

# ВІЛЬНЮСКІ РАЁН

Віленшчына адразу зацягвае ў вір гісторыі і традыцый. Тут можна атрымаць унікальны вопыт у вывучэнні нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Традыцыі і рэлігійныя ўяўленні палякаў, літоўцаў, беларусаў, украінцаў, татараў, рускіх, яўрэяў пераплятаюцца на гэтай зямлі са старажытных часоў. Ва ўзаемаўплыве гэтых культур і сфарміраваліся самабытны фальклор і адмысловыя народныя рамёствы. Маршрут адкрывае цудоўную магчымасць для знаёмства з нематэрыяльнай культурай, з традыцыямі, звязанымі са старажытнымі язычніцкімі вераваннямі, каб пранікнуць у сутнасць народных звычаяў і рамёстваў мінулых стагоддзяў, а ўдзел у адукацыйных мерапрыемствах дапаможа зразумець значнасць звычаяў і рамёстваў мінулых стагоддзяў.

1

### Замак у Мядзінінкаі

У адным з найлепш захаваных замкаў Літвы (XIV ст.) для дзяцей і дарослых ладзяцца адукацыйныя мерапрыемствы па азнаямленні з нематэрыяльнай культурнай спадчынай. Дзяцей чакае




ўрок, прысвечаны язычніцкай рэлігіі, дзе ім раскажуць пра ролю і іерархію тагачасных багоў, жрацоў-святароў, зямных уладароў. На іншых занятках можна пачуць цікавыя факты пра архітэктуру сярэднявечнага горада, даведацца пра адзенне і лад жыцця людзей сотні гадоў таму. Школьнікам будзе цікава паслухаць гісторыю ўзнікнення і развіцця грошай, як Літвы, так і ўсяго свету. Наведванне замка не абмяжуецца толькі атрыманнем тэарэтычных ведаў. Сёе-тое вучні змогуць паспрабаваць і на практыцы.

вул. Шв. Казіміеро, 2, Мядзінінкай, Вільнюскі раён, Літва
54.539399, 25.649907

www.trakaimuziejus.lt
+370 69660246

2

### Абшчына татараў Нямежыса

Усе ведаюць, што такое чабурэкі, шурпа, клёцкі ці пельмені, плоў, галубцы, пірог «перакачаўнік». Гэтыя традыцыйныя татарскія стравы сталі неад'емнай часткай культурнай спадчыны Літвы. Некаторыя лічаць, што сушанае мяса – гэта літоўская традыцыя, але на самой справе гэты далікатэс мае татарскае паходжанне. Дарэчы, як і халва, якая так падабаецца літоўцам. Нямежская абшчына дае ўнікальную магчымасць пазнаёміцца з татарскай культурай, кухняй і традыцыямі. Госці Нямежыса могуць пакаштаваць татарскія нацыянальныя стравы, схадзіць у мячэць і на могілкі, пачуць шмат цікавага з вуснаў мясцовых жыхароў.

вул. Татору, 4, Нямежыс, Вільнюскі раён, Літва
54.635799, 25.356578

www.nemeztatarcom.webs.com
+370 68695210



3

### Рэгіянальны парк «Нярыс»

Гэта самы лясісты рэгіянальны парк у Літве. Тут растуць адны з самых вялікіх і старых дубоў краіны. Гэта месца адкрыта для тых, хто хоча больш даведацца пра язычніцкую культуру, пра прыродныя і культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца па абодвух берагах ракі Нярыс (Вілія). Парк ахоплівае найпрыгажэйшую частку даліны ракі, дзе першыя людзі пасяліліся больш за 10 000 гадоў таму. Скульптуры ў дуброве Дукштас – гэта персанажы балтыйскіх легенд і паданняў. Балты, продкі літоўцаў, верылі, што бог грому Пяркунас жыве ў дубе, і таму язычнікі пакланяліся гэтаму дрэву. На тэрыторыі парка ёсць і міфалагічная сцежка (усяго ў парку налічваецца 9 сцежак). Уздоўж ракі ўзвышаюцца Кармазінскія курганы – сведкі далёкага мінулага. Курганы маглі быць насыпаны ў VI–VIII стст.




Падчас экскурсіі можна пачуць жабіны хор, прайсці па слядах лясных звяроў, пачуць цікавыя гіторыі пра старажытных балтаў.

вул. Вільняўс, 3, Дукштас, Вільнюскі раён, Літва
54.820699, 24.973770

www.neriesparkas.lt
+370 52599242

4

### Сядзіба Любавас з млыном

Вадзяны млын у сядзібе Любавас, што на беразе рэчкі Жалеса, быў пабудаваны ў XVI ст. Пазней млын некалькі разоў перабудоўвалі, а зараз тут адкрылі музей. Любаваскі млын – гэта ўнікальны аб'ект тэхнічнай, гістарычнай і культурнай нематэрыяльнай спадчыны. Млын і цяпер працуе, яго старанна аднавілі, захаваўшы нават самыя дробныя дэталі. Арганізацыя «Europa Nostra» праз год пасля рэстаўрацыі млына абвясціла музей узорным праектам па захаванні культурнай спадчыны Еўропы. Сядзіба Любавас – адна з найстарэйшых у Літве. Тут можна наведаць экспазіцыю, прысвечаную магнатам і іх сем'ям, якія жылі ў Любавасе да Другой сусветнай вайны, прагуляцца па парку пад меладычныя, чароўныя гукі вады.

вёска Любавас, Вільнюскі раён, Літва
54.850663, 25.341254

www.liubavas.lt
+370 52377077



5

### Этнаграфічны музей Віленскага краю ў Нямянчыне

Этнаграфічны музей знаёміць наведвальнікаў з нематэрыяльнай спадчынай многіх нацыянальных культур. Амаль тысяча сабраных тут экспанатаў распавядаюць пра традыцыі літоўцаў, рускіх, палякаў, беларусаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.
Пастаянная экспазіцыя музея складаецца з мноства старадаўніх прадметаў побыту, якія музею падарылі жыхары Вільнюскага раёна: збаны, міскі, тканіны, традыцыйнае адзенне, мэбля, кнігі, дакументы, мастацкія творы. Сярод экспанатаў ёсць прылады працы сялян і інструменты рамеснікаў. У музеі праходзяць выставы, канцэрты і канферэнцыі. Мясцовыя жыхары і госці могуць прыняць удзел у адукацыйных мерапрыемствах і майстар-класах і навучыцца плесці святочныя вербы, варыць мыла, асвоіць пэчварк, вылепіць або абпаліць гліняны прадмет.

вул. Швянчоню, 14, Нямянчыне,
Вільнюскі раён, Літва
54.846554, 25.464919

www.vkem.lt
+370 52377077







www.vrtic.lt



ЛІТВА

# РОКІШКІСКІ РАЁН

Рокішкіс з'яўляецца часткай этнаграфічнага рэгіёна Літвы – Аўкштайціі. Тут і па сённяшні дзень жывуць мясцовыя гаворкі, з пакалення ў пакаленне перадаюцца традыцыі, фальклор, развіваецца народнае мастацтва, рамёствы і нават захоўваюцца рэгіянальныя асаблівасці характару. Вандруючы па Рокішкіскаму краю, турысты могуць пазнаёміцца з нематэрыяльнымі скарбамі культурнай спадчыны, убачыць унікальныя аканіцы на вуліцах горада Рокішкіс, атрымаць асалоду ад прысмакаў і напояў Аўкштайціі, прыгатаваных па старых рэцэптах і тэхналогіях і ўключаных у спіс аб'ектаў нацыянальнай кулінарнай спадчыны.

6

### Краўнаскі музей

У Краўнаскім музеі большасць экспазіцый прысвечана здабыткам вясковай культуры. Тут прадстаўлены разнастайныя інструменты і вырабы рамеснікаў (сталяроў, кавалёў, ткачоў); цікавыя і каштоўныя прылады вясковых вынаходнікаў для перамолу льнянога семя і выціскання з яго алею, для шаткавання капусты, адціскання яблычнага соку, нажныя мяхі каваля і шмат іншых. У музеі адноўлены інтэр'ер вясковай хаты пачатку XX ст., праходзяць адукацыйныя праграмы «Гісторыя торбачкі», «Шэрая пчолка», «Васковы конік з ільняным хвастом».

вул. Сарту 12, вёска Краўнас,
Рокішкіскі раён, Літва
55.851196, 25.797134

www.muziejusrokiskyje.lt
+370 45841718





7

### Этнаграфічная сядзіба-музей Ё. і А. Тунайцісаў

Музей размясціўся ў старадаўніх будынках сядзібы Тунайцісаў у вёсцы Шацякшняй. Тут сабраныя ўнікальныя экспанаты, якія ілюструюць побыт вяскоўцаў XIX – сярэдзіны XX ст.: земляробчыя і рамесныя інструменты, прылады для прадзення, ткацтва, элементы нацыянальных строяў і абутку, посуд і інш. Экспазіцыя дэманструе

асаблівасці Аўкштайціі – самага вялікага этнаграфічнага рэгіёна Літвы, які вылучаецца багаццем дыялектаў, традыцый і звычаяў.

- вёска Шацякшняй, староства Панямунеліс, Рокішкіскі раён, Літва
  55.885348, 25.361917
- www.rokiskiotic.lt
  +370 61639227

8

## Вуліцы з маляванымі аканіцамі

Гэта «галерэя пад акрытым небам» адкрыта круглы год. Мастакі ўпрыгожваюць горад аканіцамі з 2003 года і ўжо распісалі больш за 250. Маляванымі аканіцамі ўпрыгожаны дамы на плошчы Непрыклаўсамібес, на вуліцах Рэспублікас, Каўна і ў іншых куточках горада. Гэта шматгадовая традыцыя маляваных аканіц надае гораду выключны мастацкі каларыт і своеасаблівы дух, стварае імпульс для мастацкага самавыяўлення.





- пл. Непрыклаўсамібес, вул. Рэспублікас, Рокішкіс, Літва
  55.962899, 25.586674
- www.rokiskiotic.lt
  +370 45851044



www.rokiskiotic.lt



9

## Дом «грыбкоў» і шакоціса ў Юодупе

Тут рэалізуюцца дзве адукацыйныя праграмы: выпяканне «грыбкоў» і шакоціса. Гэта салодкая выпечка ў Рокішкіскім і Юодупскім краі з'яўляецца неад'емным складнікам самых важных сямейных свят ужо амаль стагоддзе, таму абодва прадукты маюць сертыфікаты Літоўскага нацыянальнага фонда кулінарнай спадчыны. На майстар-класах у Юодупскім доме «грыбкоў» і шакоціса можна пачуць гісторыю ўзнікнення гэтых прысмакаў, убачыць, як у печы на дровах нараджаецца шакоціс, самастойна спячы, а потым і пакаштаваць традыцыйныя літоўскія прысмакі.
Тут падчас заняткаў госці спякуць «грыбкі» і размалююць іх на свой густ.

- вул. Пяргалес 2, Юодупе, Рокішкіскі раён, Літва
  56.089812, 25.603953
- www.facebook.com/Isadauskiene
  +370 65680373





10

**Сядзіба вінаробчага вясковага турызму Roksala**

Раймундас Нагяле – вінароб у пятым пакаленні, які беражна захоўвае сямейныя традыцыі вырабу віна з ягад і садавіны. Дзевяць гатункаў дамашніх він Раймундаса Нагяле ўключаны ў спіс аб’ектаў нацыянальнай спадчыны Літвы. Госці сядзібы могуць наведаць самы паўночны вінаграднік у Літве і пазнаёміцца з асаблівасцямі вырабу віна. На дэгустацыі він гаспадар сядзібы раскажа пра гісторыю віна, традыцыйныя спосабы яго вырабу і сучасныя тэхналагічныя працэсы.

Вёска Таручай, 8, староства Пандэляй, Рокішкіскі раён, Літва
56.145887, 25.279400

www.roksala.lt
+370 62661510

ЛАТВІЯ

# НЭРЭЦКІ КРАЙ

Культурна-гістарычныя традыцыі Нэрэцкага краю беражліва захоўваюцца і развіваюцца. Адзін з цікавых аб’ектаў – Эрбергская эстрада пад адкрытым небам, якая была зноў пабудавана на сваім гістарычным месцы. Тут можна пазнаёміцца са старадаўнімі песнямі, танцамі і гульнямі, прыняць удзел у фальклорных і рамесных мерапрыемствах і пагутарыць з прыемнымі людзьмі з Эрбергскай сядзібы. А ў Доме культуры Нэрэты варта паглядзець на новую 3D-экспазіцыю ткацтва.

11

**Мазалвэская эстрада пад адкрытым небам**

На эстрадзе пад адкрытым небам у сядзібе Эрберг Блакітная дама і Вядзьмарка запрашаюць гасцей прыняць удзел у старадаўніх гульнях і забаўках – хаджэнні на хадулях, кеглях, гульні ў хованкі, «лоўлі пацукоў» – і павучыць папулярныя латышскія танцы: «Жарабяты, жарабяты», «Пчолка ў ружовым садзе», «Апошняя пара – распадаецца!». Таксама тут можна адчаканіць старадаўнюю манету і збіць масла.
Побач з эстрадай знаходзіцца старадаўняя Эрбергская сядзіба і парк са Сцежкай легенд.

вул. Сколас, 1, Мазалвэская воласць, Нэрэцкі край, Латвія
56.364779,25.017276

www.neretasnovads.lv
+371 26156635




www.neretasnovads.lv

ЛАТВІЯ

# ЗЭМГАЛЬСКІ РЭГІЁН

Падчас экскурсіі па гэтым маршруце можна завітаць на турыстычныя аб’екты і пазнаёміцца з іх гаспадарамі, якія беражліва захоўваюць і перадаюць нашчадкам скарбы латышскай нематэрыяльнай спадчыны: этнаграфічныя народныя строі, урачыстыя традыцыі і гадавыя святы, песні, танцы, гульні, абрады, ігру на музычных інструментах, выраб упрыгажэнняў, рэцэпты і працэсы прыгатавання страў, латышскі лад жыцця і іншыя культурныя асаблівасці. Пра тое, як заўзята гэтыя людзі папулярызуюць згаданыя культурна-гістарычныя традыцыі, сведчаць адзнакі «Латышская спадчына» і «Латышская кухня», якія атрымалі некаторыя аб’екты, уключаныя ў маршрут, што сведчыць аб важнасці ўслаўлення латышскіх традыцый. Усім, хто жадае пашырыць свае веды і лепш зразумець свае карані, варта скарыстацца прапановай і згуляць у якую-небудзь старажытную гульню, пакаштаваць традыцыйныя прысмакі або адзначыць якое-небудзь свята з латышскага гадавога кола.




12

**Зэмгальская старая сядзіба «Everti»**

У ансамблі сялянскай сядзібы другой паловы XIX ст., акружанай старажытнымі будынкамі, знаходзіцца комплекс традыцыйных лазняў, якія з даўніх часоў для латышоў былі месцам адпачынку і аздараўлення цела і духу. Тут наведвальнікам прапаноўваюцца старажытныя латышскія лазневыя рытуалы: для нованароджаных, мыццё спіны нявесты, лазня для мужчынскай сілы, рытуал для зачацця, а таксама сучасныя абрады: рытуал з нагоды дня нараджэння, лазня з цырымоніяй ініцыяцыі. У сядзібе адзначаюць традыцыйныя святы гадавога кола, праводзяць разнастайныя вогненныя абрады. Тут можна прыняць удзел у творчай майстэрні «Здароўе ў сваіх руках», дзе можна даведацца пра ўнікальныя ўласцівасці бурштыну і праверыць іх сілу на сабе, звязаць спецыяльны венік для лазні, зрабіць соль з травамі, паспрабаваць рытмічны масаж двума венікамі з вярбы. А на заканчэнне праводзіцца спецыяльны рытуал з агнём згодна з абранай мэтай, падчас якога выкарыстоўваецца бурштынавы пыл і розныя рытмічныя інструменты.

«Everti», Барбэльская воласць, Вэцумніекскі край, Латвія
56.423011, 24.606901

www.everti.lv
+371 26556452

13

**Музей пад адкрытым небам «Ausekļu Dzirnavas»**

Музей «Ausekļu Dzirnavas» створаны як латышскі гаспадарчы двор, дзе можна пазнаёміцца з калекцыяй старажытных прылад працы і тэхнікі (транспартныя сродкі, механізмы, прадметы хатняга ўжытку), з побытам, са стаўленнем продкаў да працы і проста прыемна адпачыць з сям’ёй.




www.visit.jelgava.lv
www.visit.bauska.lv







За падтрымку латышскіх традыцый у сучасным турыстычным праспекце гаспадарка атрымала адзнаку «Латышская спадчына». Кожную вясну і восень у музеі традыцыйна праводзяцца святы «Пасеў» і «Жніво» з дэманстрацыяй старажытных палявых работ і рамёстваў, у якіх прымаюць удзел і наведвальнікі. Для абмалоту зерня на свяце выкарыстоўваецца малатарня латвійскай вытворчасці «Imanta», якая працуе ад паравой машыны, у адноўленым вадзяным млыне сіла вады дазваляе змалоць збожжа, нарыхтаваць ячныя і іншыя крупы. Тут малоцяць збожжа і з дапамогай коннага ворату, плятуць кошыкі, уюць вяроўкі, дзяруць лазу і займаюцца мноствам іншых рамесных спраў.
У музеі можна ўбачыць адзіны ў Латвіі паравоз «Ruston» (1912), які быў выраблены ў Англіі і сёння знаходзіцца ў працоўным стане. Таксама тут працуе драўляны ветраны млын.

«Ausekļu Dzirnavas», Барбэльская воласць, Вэцумніекскі край, Латвія
56.441210, 24.582840

www.ausekludzirnavas.lv
+371 29197412

14

## Сялянская гаспадарка «Vaidelotes»

Паняцці сялянская гаспадарка і латышскі лад жыцця цесна суіснуюць у гаспадарцы, якая атрымала адзнаку «Латышская спадчына» за захаванне латышскіх традыцый і адзнаку «Латышская кухня» за прыгатаванне і папулярызацыю традыцыйных страў.
У гаспадарцы можна ўбачыць калекцыі







араматычных траў і лекавых раслін, пакаштаваць лекавую гарбату, пазнаёміцца са старадаўняй латышскай кухняй, адпачыць пад векавым дубам. Гаспадыня можа паказаць, як выпякаць пірагі і шэры пшанічна-ячменны хлеб з цэльназерневай мукі грубага памолу, як гатаваць сыр на Янаў дзень, як зразумець тэхналогію прыгатавання хлеба, як зрабіць цэльназерневыя пончыкі, жыць з радасцю і ў гармоніі з прыродай. Тут таксама можна купіць гарбату, спецыі і вясковыя прысмакі.

«Vaidelotes», Цодзкая воласць, Баўскі край, Латвія
56.427692, 24.226141

www.vaidelotes.lv
+371 29389993

15

## Стальгенская сядзіба (Гадавое кола латышскіх традыцыйных свят)

Гадавое кола латышскіх традыцыйных свят у парку Стальгенскай сядзібы задумана ў выглядзе старажытнага сонечнага каляндара, які адлюстроўвае ход Сонца, увасоблены ў светапоглядах латышоў. Кола складаецца з 8 валуноў, што сімвалізуюць каляндарныя латышскія святы. На кожным валуне выгравіраваны латышскі знак адпаведнай пары года. Зямля, якая за год робіць абарот вакол Сонца, мае 8 значных пунктаў, якія продкі латышоў называлі каляндарнымі святамі і адзначалі іх. Яны спецыяльна рыхтаваліся да свят, спявалі песні, вадзілі карагоды, гатавалі адмысловыя стравы, выконвалі абрады, каб прыцягнуць удачу, радасць, здароўе, дабро і адштурхнуць зло, выказаць падзяку за дасягненні, забяспечыць урадлівасць і добры ўраджай.




Кожнаму наведвальніку жадаюць атрымаць асалоду ад гэтага месца, а таксама прапануюць разам з мясцовым фальклорным калектывам паўдзельнічаць у мерапрыемствах, прысвечаных святам гадавога кола.

вул. Сколас, 2, Стальгенэ, Яўнсвірлаўкская воласць, Елгаўскі край, Латвія
56.571819, 23.961425

www.visit.jelgava.lv
+371 26383129



Латвія
Літва
Беларусь
RĪGA
VILNIUS
Полацк
Jelgava
Jēkabpils
Daugavpils
Rokiškis
Šiauliai
Panevėžys
Kaunas
Talsi
Saulkrasti
Cēsis
Sigulda
Sabile
Tukums
Jūrmala
Salaspils
Ogre
Olaine
Madona
Biksti
Dobele
Ozolnieki
Vecbebri
Koknese
Skrīveri
Aizkraukle
Pļaviņas
Iecava
Vecumnieki
Valle
Staļģene
Auce
Tērvete
Eleja
Pilsrundāle
Bauska
Skaistkalne
Žagarė
Ērberģe
Viesīte
Sala
Vīpe
Līvāni
Zasa
Atašiene
Viļāni
Rēzekne
Ludza
Preiļi
Akmenė
Joniškis
Žeimelis
Lauksodis
Biržai
Nereta
Aknīste
Tadenava
Kaldabruņa
Juodupė
Papilė
Pasvalys
Obeliai
Krāslava
Pakruojis
Gaulėnai
Radviliškis
Kupiškis
Kamajai
Kriaunos
Zarasai
Dusetos
Šiaulėnai
Kelmė
Upytė
Kražiai
Užpaliai
Anykščiai
Visaginas
Utena
Tauragnai
Ignalina
Raseiniai
Kėdainiai
Ukmergė
Molėtai
Švenčionys
Jurbarkas
Meškonys
Girija
Maišiagala
Pričiūnai
Nemenčinė
Kazlų Rūda
Vilkaviškis
Prienai
Birštonas
Trakai
Paliepiukai
Bareikiškės
Nemėžis
Juodšiliai
Medininkai
Marijampolė
Kalvarija
Alytus
Šalčininkai
Ашмяны
Верхнядзвінск
Кляcціцы
Краснаполле
Браслаў
Міёры
Опса
Дзісна
Навапалацк
Палата
Гарадок
Мішневічы
Шаркаўшчына
Казьяны
Празарокі
Бікульнічы
Обаль
Ула
Ушачы
Пастaвы
Глыбокае
Лынтупы
Бешанковічы
Бароўка
Нарач
Мядзел
Лепель
Альхоўка
Докшыцы
Сянно
Бягомль
Новалукомль
Смаргонь
Вілейка
A1
A2
A4
A5
A6
A7
A8
A9
A10
A11
A12
A13
A14
A16
E22
E67
E77
E85
E262
E272
P3
P14
P20
P27
P45
P46
M1
M3
M8
1
2
3
4
5
6
7
8
9
10
11
12
13
14
15
16
17
18
19
20
21
22
23
24
25
26
27
28
29
30
Riga
Латвія
Літва
Vilnius
Беларусь
Мінск
Земгальскі рэгіён
Нэрэцкі край / Горад Екабпілс
Рокішкіскі раён / Вільнюскі раён
Горад Полацк і Полацкі раён

16

## Сельская сядзіба з латышскімі традыцыямі «Caunītes»

Сядзіба, якая атрымала адзнаку «Латышская спадчына» за захаванне і папулярызацыю латышскіх традыцый, вучыць наведвальнікаў шанаваць старыя традыцыі, напрыклад, адзначаць дні Мартыньша, Метэніса, Вусіньша, Екаба, Мары і іншыя каляндарныя святы. Гэта месца, куды з задавальненнем запрашаюць тых, хто хоча атрымаць асалоду ад нацыянальнай атмасферы і ад простай гутаркі з людзьмі. У залежнасці ад латышскага каляндарнага свята гасцям прапануюць розныя віды дзейнасці. Цэнтральнае месца ў сядзібе займае свіран з хлебнай печчу. Наведвальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца са старажытным працэсам выпякання хлеба – ад зерня да гатовага бохана хлеба. Можна заняцца і творчай дзейнасцю: зрабіць калядная павука, сонейкі, маскі.

«Caunītes», Цэнская воласць,
Озалніекскі край, Латвія
56.722517, 23.791061
www.caunites.lv
+371 26352395


18

17

## Энергетычная лазня «Lielzemenes»

Пасярод маляўнічага лесу латышскі лад жыцця практыкуюць і папулярызуюць гаспадары лазні, якія пачалі адраджаць лазневыя традыцыі і рытуалы Латвіі. Лазеншчыкі добра разбіраюцца ў псіхатэрапіі і маюць шырокі кругагляд. Гаспадары не толькі займаюцца сельскім турызмам і штогод выкладаюць у школе лазеншчыкаў, але і з'яўляюцца аўтарамі дзвюх кніг пра латышскі жыццёвы ўклад. Папулярызацыя даўніх латышскіх лазневых традыцый, аздараўленне і стварэнне гармоніі для гасцей уключаюць у сябе старажытны рытуал для нованароджаных, рытуал ініцыяцыі, спецыяльныя ванны для жанчын, дзе выкарыстоўваюцца прыродныя матэрыялы. У наведвальнікаў ёсць магчымасць самастойна правесці рытуалы, з невялікай дапамогай гаспадароў, якія такім чынам перадаюць свае веды і навыкі іншым.

«Lielzemenes», Вэцумніекская воласць,
Вэцумніекскі край, Латвія
56.623058, 24.497366
www.lielzemenes.lv
+371 26160989

18

## Музей народных музычных інструментаў «Skaņumāja»

У памяшканнях таварыства «Skaņumāja» ў Крапскай воласці размяшчаецца экспазіцыя латышскіх традыцыйных музычных інструментаў. Тут можна пазнаёміцца са зробленымі ў Латвіі музычнымі інструментамі, на якіх гралі на працягу апошніх 100 гадоў, прасачыць шлях іх развіцця, паслухаць гучанне ці паспрабаваць самім сыграць на старадаўніх інструментах.
На выставе прадстаўлены куокле, цытры, гармонікі рознай канструкцыі, скрыпкі, мандаліны і іншыя інструменты, зробленыя як замежнымі, так і мясцовымі майстрамі. Інструменты выразна ілюструюць разнастайнасць музычных традыцый, змены, якія адбыліся з цягам часу, і рэгіянальныя адрозненні.

«Krapes», Крапская воласць,
Огрскі край, Латвія
56.745664, 25.102043
www.muzikanti.lv
+371 26162146


www.visit.bauska.lv
www.visit.jelgava.lv
https://visit.skriveri.lv

17


16


17


16


17




https://visit.skriveri.lv
www.aizkraukle.lv
www.visitkoknese.lv













19

## Сялянская гаспадарка «Ragāres»

У гаспадарцы на высокім беразе Даўгавы растуць розныя віды і гатункі дэкаратыўных і лекавых раслін, араматычных траў, а таксама традыцыйныя латышскія агародныя расліны. Гаспадарка мае некалькі сертыфікатаў: «Латвійскі Экапрадукт», «Экалагічная сельская гаспадарка», – і з'яўляецца пераможцай конкурсу «Кліч продкаў». Наведвальнікі маюць магчымасць убачыць у натуральным асяроддзі, дакрануцца і адчуць водар больш за 100 розных раслін, атрымаць новыя веды па земляробстве з прымяненнем экалагічных метадаў, якімі карысталіся продкі сучасных латышоў. У «Ragāres» можна пакаштаваць смачную экалагічную гарбату, сабраную і прыгатаваную сваімі рукамі, ягады і садавіну, салаты са свежай зяляніны, а таксама набыць гатовыя прадукты. На думку ўладальнікаў, калі пераняць ад продкаў у спадчыну ўнікальныя веды і уменні, нават пустазелле можна пераўтварыць у вельмі патрэбныя для нашага харчавання і арганізма расліны.

«Ragāres», Скрывэрская воласць,
Скрывэрскі край, Латвія
56.627343, 25.086079
www.ragares.com
+371 29229588

20

## Айзкраўкльскі музей гісторыі і мастацтва «Kalna Ziedi»

Музей прапануе наведвальнікам паглядзець пастаянную экспазіцыю «Гісторыі лёсу Даўгаўскіх берагоў», якая адлюстроўвае жыццё на берагах Даўгавы ў першай палове XX ст. Тут можна ўбачыць узноўлены селійскі старажытны народны строй, прыняць удзел у педагагічных праграмах, традыцыйных латышскіх гульнях і забавах: маскараднай традыцыі, каляндарна-абрадавых святах і мерапрыемствах для сем'яў. У музеі ёсць адкрытае сховішча, з багатай калекцыяй разнастайных рамесных прылад. Госці могуць, напрыклад, паспрабаваць збіць масла. Кожны год у канцы ліпеня ў музеі праводзяцца Дні каваля.

«Kalna Ziedi», вул. Музэя, Айзкраўклэ,
Айзкраўкльскі край, Латвія
56.598941, 25.271577
www.aizkrauklesmuzejs.lv
+ 371 65123351




21

## Дом творчасці таварыства «Baltaine»

Таварыства «Baltaine», якое аднаўляе і папулярызуе нематэрыяльную культурную спадчыну Кокнэсэ і яго ваколіц, з'яўляецца лаўрэатам Латвійскай фальклорнай прэміі ў намінацыі «Народная мудрасць», а таксама лаўрэатам фальклорнай прэміі «Austras koks». Мерапрыемствы Дома творчасці, вядомыя па ўсёй Латвіі: каляндарныя святы гадавога кола, сямейныя ўрачыстасці, кулінарныя майстар-класы, а таксама іграа на музычных інструментах і рукадзелле. Сыграць у гульні, вывучыць новы танец, паспяваць разам з фальклорным гуртом «Urgas» захапляльна ў любым узросце. На рамесных майстар-класах можна пераняць уменні і навыкі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, паспрабаваць свае сілы ў прадзенні, суканні, вязанні кручком і на спіцах, пляценні, макрамэ, вышыванні, складанні з паперы, вырабе саламяных упрыгажэнняў і іншых занятках. Каша «Baltaines», густы суп «Būnīšu», цыкорная кава з піражком з вотруб'я здзівяць нават знаўцу кулінарнай спадчыны.

вул. Мэліяратару, 1А, Кокнэсэ,
Кокнэскі край, Латвія
56.644123, 25.441814
www.visitkoknese.lv
+371 26575499

22

### Локстэнская бажніца

Локстэнская бажніца знаходзіцца на востраве на рацэ Даўгава і прызначана для ўслаўлення латышскай народнай мудрасці, што ляжыць у аснове старажытных духоўных і маральных каштоўнасцей, якія захаваліся ў традыцыйных песнях латышскага народа – *dainas*. Божы двор складаецца з Плошчы сцяга, Старажытнай каменнай стэлы, Брамы Сонца і будынка бажніцы. Вакол бажніцы раскінуліся маляўнічыя краявіды. Яна з’яўляецца важнай для Латвіі культурна-гістарычнай мясцовасцю, разам з Сэлпілсам і з Олынькалнсам, Локстэнскім гарадзішчам і Стабурагсам, якія ў цяперашні час затопленыя. Да бажніцы можна дабрацца на пароме. Гэта месца можна не толькі наведаць з аглядам, але і зарэзерваваць для правядзення сямейных урачыстасцей і латышскіх каляндарных свят.




«Liepsalas», Клінтайнская воласць,
Плявіньскі край, Латвія
56.598900, 25.655900

www.dievturi.blogspot.com
+371 26449567

www.plavinunovads.lv

**Далейшую інфармацыю пра турыстычныя аб’екты Зэмгальскага рэгіёна глядзіце на старонцы 22.**




ЛАТВІЯ

# ГОРАД ЕКАБПІЛС

Екабпілс ганарыцца багатай і непаўторнай фальклорнай спадчынай і традыцыямі, якія і ў нашы дні застаюцца важнай часткай латвійскай культуры і вызначаюць самабытнасць латышоў. Размешчаная пад адкрытым небам частка Екабпілскага гістарычнага музея – «Падвор’е селаў» – адзінае месца ў Латвіі, дзе ў комплексе захаваліся драўляныя будынкі, прадметы побыту, прылады працы і прадстаўлены навыкі і традыцыі XIX стагоддзя. У падарожнікаў ёсць цудоўная магчымасць убачыць сапраўдныя сельскія будынкі рэгіёна Аўгшзэмэ і пазнаёміцца са старажытнымі рамёствамі і традыцыямі селаў.




www.jekabpils.lv




23

### Музей гісторыі Екабпілса, «Падвор’е селаў» пад адкрытым небам

На левым беразе Даўгавы пад адкрытым небам знаходзіцца «Падвор’е селаў». Экспазіцыя музея складаецца з шасці традыцыйных аўгшзэмскіх сельскіх будынкаў XIX ст., якія паказваюць рэальнае штодзённае жыццё латышоў таго часу. Тут можна ўбачыць прылады працы і прадметы побыту сярэднезаможнага сяляніна з Селіі XIX ст. Таксама наведвальнікі могуць прыняць удзел у адукацыйных праграмах «Майстэрня па вырабе мыла», «Папяровы шлях», «Моц прыроды», «Майстэрня па вырабе свечак» і паспрабаваць свае сілы ў розных рамёствах: спрасці пражу, змалоць муку, збіць масла і зрабіць кменавы сыр. «Падвор’е селаў» таксама прапануе адсвяткаваць у адпаведнасці са старажытнымі традыцыямі найважнейшыя для латышоў сямейныя падзеі – хрэсьбіны і вяселле.

вул. Філазофу, 6, Екабпілс,
Екабпілскі край, Латвія
56.495701, 25.873899

www.jekabpilsmuzejs.lv
+371 27029039

24

### Экалагічная гаспадарка «Boļāni»

Падчас візіту ў гаспадарку селійская гаспадыня-пявуння Мая пазнаёміць гасцей са старажытнымі легендамі, рэаліямі і традыцыямі вясковага жыцця. Кожную вясну ў маі можна пачуць характэрную для Сэлпілса прыродную акустыку пагоркаў з галасамі і водгаласамі. У гаспадыні ёсць віртуальная шафа з дайнамі (іх 3389), складзенымі і запісанымі ў Сэлпілсе, якія можна пачытаць. У гэтым прыгожым месцы можна пакаштаваць і набыць цудоўную







зёлкавую гарбату, фруктова-ягадныя цукеркі, характэрны для Селіі шэры пшанічны або ячменны хлеб, а таксама навучыцца выпякаць яго па старых сямейных рэцэптах. Аматарам пешых прагулак варта схадзіць у пазнавальныя паходы па прыродных сцежках, у тым ліку да пункта геадэзічнай дугі Струвэ «Daborkalns».

«Boļāni», Сэлпілская валасць,
Салскі край, Латвія
56.585689, 25.687046

www.bolani.mozello.lv
+371 26496601

25

### Парк латышскіх этнаграфічных знакаў

Латышскія этнаграфічныя знакі сфарміраваліся больш за 3000 гадоў таму назад і выкарыстоўваліся як сімвалы, элементы, носьбіты інфармацыі і формы выражэння энергіі. Парк старажытных латышскіх знакаў, які будаваўся з 2008 па 2018 год, з'яўляецца адзіным паркам такога тыпу ў Латвіі. Тут можна ўбачыць 11 знакаў, зробленых мясцовымі майстрамі з дубу, якія на працягу стагоддзяў надавалі латышам сілу, здароўе, забяспечвалі добры ўраджай, напрыклад, знакі *Zalktis, Jumis, Saule* і іншыя. Аповед экскурсавода дапоўнены відэапрэзентацыяй пра стварэнне парку, наведвальнікам прапануюцца цікавыя гульні і задачы пра латышскія этнаграфічныя знакі.

Лэймані, Лэйманьская валасць,
Екабпілскі край, Латвія
56.310335, 25.925690

www.jekabpilsnovads.lv
+371 25945299

26

### Селійская сельская сядзіба «Gulbji»

Адно з нешматлікіх месцаў у Латвіі, дзе можна ўбачыць і адчуць характэрны для гістарычнага рэгіёна Селія каларыт «жывой» сядзібы. Прырода, створаны сваімі сіламі




невялікі этнаграфічны музей, селійская кухня, калекцыя лекавых раслін і старыя будынкі са сваімі гісторыямі – не дзіўна, што сядзіба атрымала адзнакі «Латышская спадчына» і «Латышская кухня». Гаспадары




**Зэмгальскі рэгіён**

www.jekabpils.lv
www.jekabpilsnovads.lv












прапануюць экскурсіі, у час якіх можна пазнаёміцца з даўнімі селійскімі традыцыямі, прыгатаваць і пакаштаваць стравы старажытных селійцаў – поліўку, смажаныя, фаршыраваныя бульбяныя клёцкі і зёлкавую гарбату, а таксама схадзіць у лазню, выцепленую па-чорнаму, з венікамі з лугавых раслін і дамашнім раслінна-мядовым скрабам. Тут таксама можна заначаваць, даведацца пра старажытныя латышскія знакі сілы, адзначыць святы ў адмысловай атмасферы, з адпаведнымі песнямі, танцамі і гульнямі.

«Gulbji», Рубэнская воласць, Екабпілскі край, Латвія
56.136800, 26.064000

www.jekabpilsnovads.lv
+371 26416231

27

## Музей лугу

Музей лугу адкрыты ў былой пачатковай школе Калдабруні, дзе можна ўбачыць арыгінальную экспазіцыю, створаную ў выглядзе жыццёвага шляху чалавека ў непарыўнай сувязі з прыродай і латышскімі народнымі традыцыямі. За ўслаўленне лугоў музей атрымаў адзнаку «Латышская спадчына». Асобныя экспазіцыі прысвечаны мятліцам, раслінам з латвійскіх прыродных лугоў і раслінам, якія знаходзяцца пад аховай. Мультымедыйная экспазіцыя «Поўнач на лузе» выклікае асаблівыя пачуцці. Відэаматэрыял змяшчае тэкставую інфармацыю, вобразны рад, гукі і пейзажы, якія распавядаюць пра традыцыі, звязаныя з дзейнасцю пасля змяркання. Гордасцю Селійскага краю з'яўляецца пояс Калдабруньскай Мары, копія якога знаходзіцца ў музеі. Наведвальнікі могуць station, як працуе машына для лазернай гравіроўкі, убачыць, як ствараюцца шкляныя ўпрыгажэнні і прадметы інтэр'еру, і паўдзельнічаць у працэсе.

«Kaldabruņas skola», Рубэнская воласць, Екабпілскі край, Латвія
56,095033, 26,067339

www.udenszimes.lv
+371 29548967
















# ГОРАД ПОЛАЦК І ПОЛАЦКІ РАЁН

Запрашаем наведаць самы старажытны горад Беларусі! Ужо з 862 года Полацк, размешчаны на рацэ Заходняя Дзвіна, вядомы як буйны гандлёвы і рамесны цэнтр Усходняй Еўропы. Горад захаваў самабытныя рамесныя традыцыі, закладзеныя стагоддзі таму назад, і з задавальненнем прапануе сваім гасцям пазнаёміцца з імі, падчас майстар-класаў зрабіць сваімі рукамі пояс, ляльку-абярэг або дыван-маляванку.







28

## Багатырскі сельскі дом культуры

У Полацкім рэгіёне захавалася ўнікальная старажытная песенная традыцыя выканання купальскіх і жніўных песень «у перахлёст» – самабытная версія антыфонных спеваў. Спяванне «ў перахлёст» характэрна толькі для Полацкага рэгіёна, вылучаецца адметнымі рысамі, з якімі наведвальнікі змогуць пазнаёміцца падчас абрадаў або майстар-класаў з фальклорным калектывам «Галасы Спадчыны»: развучыць некалькі традыцыйных песень і паглыбіцца ў меладычнае гучанне архаічнага спеву.

вёска Багатырская, 25, Полацкі раён, Віцебская вобласць, Беларусь
55.501482, 28.854541

www.polotsk-turizm.com
+375 214466949

29

## Інфармацыйны турыстычны цэнтр горада Полацка

Святочныя традыцыі беларусаў пачалі фарміравацца яшчэ ў старажытнасці і з моманту свайго ўзнікнення усё больш папаўняліся рытуаламі. Падчас майстар-класаў па традыцыйных беларускіх танцах і песнях з фальклорным калектывам «Варган» усе жадаючыя змогуць развучыць аўтэнтычныя песні і танцы беларусаў гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Падзвінне, змогуць стаць удзельнікамі каляндарных абрадаў, характэрных для дадзенага этнаграфічнага рэгіёна: Масленіцы, Купалля, Багача, валачобнага абраду.

пр-т Ф. Скарыны, 8, г. Полацк, Віцебская вобласць, Беларусь
55.485158, 28.766435

www.polotsk-turizm.com
+375 214466949

30

## Арт-праект «Узоры на дрэвах»

Арнамент – традыцыйны набор сімвалаў і кветак, якія выкарыстоўвалі продкі беларусаў шмат стагоддзяў таму. Кожны з іх абазначаў нешта асаблівае і выконваў сваю функцыю. Арт-праект дазволіць сучаснаму чалавеку дакрануцца да сакральнага пласта славянскай духоўнай народнай культуры, раскрыць багацце значэнняў і сэнсаў старажытных узораў. Убачыць яго можна, спускаючыся ад помніка Ефрасінні Полацкай да старажытнага гарадзішча.

Гістарычная частка горада Полацка,
вул. Е. Полацкай насупраць
Вала Івана Грознага, Беларусь
55.488533, 28.768000

www.polotsk-turizm.com
+375 214466949



29



www.polotsk-turizm.com

28

Гэта брашура падрыхтавана для праекта ENI-LLB-1-108 «Павышэнне канкурэнтаздольнасці і ўстойлівасці турызму ў сферы культуры, садзейнічанне захаванню, даступнасці і развіццю нематэрыяльнай культурнай і гістарычнай спадчыны ў Латвіі, Літве і Беларусі» Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія-Літва-Беларусь у рамках Еўрапейскага інструмента суседства на 2014-2020 гг. (Rediscover the roots of regions), якая накіравана на садзейнічанне захаванню, даступнасці і развіццю нематэрыяльнай культурнай і мясцовай гістарычнай спадчыны шляхам павышэння ўстойлівай канкурэнтаздольнасці культурнага турызму ў Латвіі, Літве і Беларусі.

Агульны бюджэт праекта – 1 031 590,97 еўра (2 425 786,17 беларускіх рублёў). Уклад Еўрапейскага Саюза (90%) – 928 431,87 еўра (2 183 207,54 беларускіх рублёў).
Праграма трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія-Літва-Беларусь у рамках Еўрапейскага інструмента суседства на 2014-2020 гг. спрыяе сінергетычнаму партнёрству латвійскіх, літоўскіх і беларускіх арганізацый пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. Стратэгічная мэта Праграмы – умацаванне адносін, павышэнне патэнцыялу і абмен вопытам паміж людзьмі і арганізацыямі шляхам рэалізацыі сумесных дзеянняў, накіраваных на павышэнне агульнай якасці жыцця ў прыгранічных рэгіёнах. Фінансаванне ЕС для Праграмы складае 74 мільёны еўра.

Дзяржавы-члены Еўрапейскага Саюза вырашылі паступова злучыць свае ноу-хау, рэсурсы і лёсы. Сумесна яны стварылі зону стабільнасці, дэмакратыі і ўстойлівага развіцця, захоўваючы пры гэтым культурную разнастайнасць, памяркоўнасць і павагу да асабістай свабоды. Еўрапейскі Саюз бярэ на сябе абавязацельства дзяліцца сваімі дасягненнямі і каштоўнасцямі з краінамі і народамі, якія знаходзяцца за яго межамі.

Гэта брашура фінансуецца Еўрапейскім Саюзам. Гэта брашура была падрыхтавана пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза. Яе змест з’яўляецца выключнай адказнасцю Зэмгальскага планіровачнага рэгіёна і не з’яўляецца адлюстраваннем афіцыйнай пазіцыі Еўрапейскага Саюза.

Мы дзякуем партнёрам па праекце за супрацоўніцтва: аддзелу спорту і турызму Полацкага раённага выканаўчага камітэта, муніцыпалітэту Нэрэцкага краю, муніцыпалітэту горада Екабпілса, Рэгіянальнаму музею горада Рокішкіса, муніцыпалітэту Вільнюскага раёна, уладальнікам аб’ектаў і пастаўшчыкам турыстычнай інфармацыі Зэмгальскага рэгіёна і Полацкага раёна, якія ўдзельнічалі ў стварэнні выдання.

Гэтая праграма фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

ЛАТВІЯ ЛІТВА БЕЛАРУСЬ 2014-2020

**Выдавец:** Зэмгальскі планіровачны рэгіён, www.zemgale.lv, 2021
**Дызайн, макет:** Ёланта Дэге
У брашуры выкарыстаны фотаздымкі латвійскіх, літоўскіх і беларускіх турыстычных інфармацыйных арганізацый, уладальнікаў аб’ектаў, музеяў, аддзела спорту і турызму Полацкага раённага выканаўчага камітэта, муніцыпалітэта Нэрэцкага краю, муніцыпалітэта горада Екабпілса і архіва Рокішкіскага краязнаўчага музея. Аўтары - Оскар Калныньш, Угіс Настэвіч, Марыян Дзвінэл, Гінтарас Каросас, Відмантас Балкунас.

Глядзі і
шукай іншыя
турыстычныя
маршруты









Латвія I Літва I Беларусь